

ЯКОМУ МЕДЫЙНАМУ БРЭНДУ ДАВЯРАЮЦЬ МІНЧАНЕ 4

ЗОРНЫ ШЛЯХ НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ 5





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА +TV ПРАГРАМА

4 ЛІСТАПАДА 2022 г. ПЯТНІЦА № 217 (29839)


# НАРОДНАМУ ПАЭТУ — НАРОДНАЯ ПАМЯЦЬ

## Беларусь адзначыла 140-годдзе Якуба Коласа




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам урачыстасцяў, прысвечаных юбілею класіка: «Геній яго паэтычнага таленту раскрыўся на зломе эпох, калі ў пачатку ХХ стагоддзя адбываўся пошук нацыянальнай ідэнтычнасці і шляхоў далейшага развіцця нашага народа. Шэдэўры класіка выявілі самыя тонкія грані беларускай душы, паднялі на вяршыні мастацтва роднае слова, сталі заклікам і запаветам суайчыннікам аб святым абавязку самаадданага служэння Радзіме». Прэзідэнт падкрэсліў, што коласаўскае слова пра шчырую любоў да роднага краю, неабходнасць абараняць бацькоўскі парог, памятаць гісторыю і свае карані і сёння ўражвае актуальнасцю і выступае духоўнай асновай сучаснага грамадства.**

**А ўрачыстасці гэтымі днямі сапраўды праходзяць маштабныя. Сёлетнія юбілейныя Каласавіны адзначыліся адкрыццём помніка пісьменніку ў Стоўбцах, літаратурна-музычнымі святамі на мемарыяльных сядзібах і навуковай канферэнцыяй.**

### ГУЧНАЕ СЛОВА КЛАСІКА

Святочныя мерапрыемствы распачаліся ўрачыстай цырымоніяй ускладання кветак каля помніка народнаму песняру на плошчы яго імя ў Мінску. Удзельнікамі мерапрыемства сталі сваякі класіка, пісьменнікі, паэты, супрацоўнікі музеяў, а таксама навучэнцы мінскіх школ. З віншавальнымі словамі да гасцей звярнуўся **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ**:

— Жыццё Якуба Коласа — яркая старонка ў гісторыі беларускай літаратуры 50 гадоў Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч плённа працаваў на ніве нацыянальнай культуры, паслядоўна і мэтанакіравана змагаўся за адраджэнне свайго краю і аддаў сваё жыццё, каб беларусы ніколі не зведалі таго часу, калі безыменным быў край і народ не ведаў свайго імя. Дзейнасць Якуба Коласа высока ацэнена нашчадкамі. Імем Коласа названы вуліцы, плошчы, школы і бібліятэкі. У сталіцы і на малой радзіме песняра шматлікіх наведвальнікаў сустракаюць музеі.

СТАР. 3

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ГУРСКІ, галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Цяпер у сусветнай эканоміцы назіраецца сур'ёзнае ўзмацненне канфліктнасці ў міжнародных эканамічных адносінах. Ідзе супрацьстаянне сусветных цэнтраў сілы, і многія эканамічныя сувязі разрываюцца. Гэта, натуральна, фарміруе новыя выклікі і пагрозы для любой сацыяльна-эканамічнай сістэмы. Эканоміка, якая рэгулюецца дзяржавай, аказваецца значна больш прыстасаванай і ўстойлівай ва ўмовах такой сусветнай турбулентнасці. Наша дзяржава гарантуе сацыяльныя выгоды для насельніцтва, актыўна падтрымлівае ўласнага вытворцу, стымулюе экспарт і імпартазамяшчэнне. Гэта служыць асновай для таго, каб эканоміка хутчэй адаптавалася да тых змен, якія адбываюцца ў іншых краінах».*

## КОРАТКА

- **Магілёў стаў першым абласным цэнтрам, дзе запрацаваў дадатак «Мой горад».**
- Новы цэх па вытворчасці каўбасных вырабаў адкрылі ў Кобрыне.
- **Прэзідэнцкі спартыўны клуб запускае новы праект для прыхільнікаў валейбола.**
- Буйны малочнатаварны комплекс пабудавалі ў Камянецкім раёне.

ISSN 1990 — 763X

Жыць — цікава!

## НА ПОЛІ РЭАЛЬНЫМ І ВІРТУАЛЬНЫМ

### Як гэта — быць перадавым механізатарам і паспяховым ціктокерам

**На палях Віцебскай вобласці вядзецца пад'ём зябліва. На сёння ў паўночным рэгіёне ўзаралі амаль 60 тысяч гектараў плошчаў з запланаваных 257 тысяч. Гаспадаркі актыўна нарошчваюць тэмпы, каб значна зменшыць аб'ёмы вясенніх палявых работ.**



У Віцебскім раёне неабходна ўзараць 20 тысяч гектараў плошчаў. Пакуль з запланаванай колькасці апрацавана амаль 8,5 тысячы. Механізатары працуюць ад відна да відна, каб паспець падрыхтаваць глебу да першых маразоў. Ва ўнітарным прадпрыемстве «Рудакова» на пад'ёме зябліва задзейнічаны тры атрады з дзесяці трактароў, за якімі замацаваны галоўныя спецыялісты гаспадаркі. У адным з такіх сельскагаспадарчых дэсантаў на энерганасычаным «Кіраўцы К7» шчыруе **механізатар** з 18-гадовым стажам **Ігар МАСАЛАЎ**, якога ведаюць на Віцебшчыне не толькі па высокіх працоўных дасягненнях, але і па акаўнце ў Тік-Ток, дзе сёння звыш 22 тысяч падпісчыкаў.

СТАР. 3

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Усё ў нашых руках. Як дамовімся, так і будзе»

**Практыка візітаў дэлегацый расійскіх рэгіёнаў у Палац Незалежнасці працягваецца. Гэтым разам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з губернатарам Растоўскай вобласці Васіліем Голубевым.**

На пачатку сустрэчы беларускі лідар нагадаў, што ў свой час — а канкрэтна ў 2017 годзе, калі кіраўнік гэтага расійскага рэгіёна наведваў з візітам нашу краіну, — была вызначана «дарожная карта» двухбаковых адносін, абмяркоўваўся выхад гандлю паміж Беларуссю і Растоўскай вобласцю на больш высокі ўзровень. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў Васілія Голубева, як ажыццяўляецца работа ў гэтым кірунку, як рэалізоўваюцца сумесныя планы.

Аднак перш чым пачаць абмеркаванне ключавых момантаў двухбаковага супрацоўніцтва, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў сувязі з канфліктам ва Украіне пагранічная з ёй Растоўская вобласць знаходзіцца ў няпростай сітуацыі, таму пажадаў мужнасці і стойкасці ў пераадоленні тых праблем, якія дадатковa ўзніклі ў рэгіёна.

## «ЁСЦЬ ДА ЧАГО ІМКНУЦЦА»

Вяртаючыся да тэмы супрацоўніцтва Беларусі з Растоўскай вобласцю, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за мінулыя пяць гадоў сітуацыя моцна змянілася. Таму, па яго словах, ёсць сэнс з улікам рэалій, якія склаліся, па-новаму зірнуць на перспектывы двухбаковага ўзаемадзеяння. «Змены, якія адбыліся за пяць гадоў, закранулі толькі знешнія фактары, але ніяк не адносіны паміж нашымі брацкімі народамі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Хачу вас яшчэ раз запэўніць: у Беларусі вам заўсёды рады і гатовы дапамагчы ўсім, на што мы здольныя».

Галоўнымі інструментамі падтрымкі адзін аднаго беларускі лідар назваў імпартазамяшчэнне і вытворчую кааперацыю. Цяпер, па перакананні кіраўніка дзяржавы, гэта важна як ніколі. Аб гэтым прэзідэнты Беларусі і Расіі вельмі часта гавораць падчас сустрэч. Ні адна з іх, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, не праходзіць без абмеркавання гэтых пытанняў.

Датычна ўзаемадзеяння з Растоўскай вобласцю беларускі лідар паведаміў, што за восем месяцаў бягучага года мы нагандлявалі на 420 мільёнаў долараў (30 % прыросту да ўзроўню папярэдняга года). «Летась перавысілі планку паўмільярда долараў, якую намецілі ў 2017 годзе, — удакладніў ён. — Вядома, гэта нядрэнны паказчык, але ёсць над чым працаваць, ёсць да чаго імкнуцца. Сёння, як ні дзіўна, вялікай падтрымкай у нашай рабоце стала не ўзаемадапаўняльнасць, аб якой мы пастаянна гаварылі (гэта і застаецца), а якраз падабенства падыходаў да развіцця народнай гаспадаркі ў Беларусі і на Доне».

Калі пасля лютага гэтага года «Ростсельмаш» адчуў на сабе ўвесь цяжар заходніх санкцый, нашы гомельскія вытворцы сельскагаспадарчай тэхнікі падставілі плячо, падтрымаўшы расійскую вытворчасць неабходнымі вузламі і камплектуючымі. «Дагэтуль мы нейкімі канкурэнтамі былі, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі мне далажылі аб гэтым, я адназначна выказаўся за тое, каб «Гомсельмаш» на ўсё, на што ён здольны, аказаў падтрымку «Ростсельмашу». Што нам дзяліць? У нас два вялізныя прадпрыемствы, дай Бог, каб выканалі заказы спажыўцоў. Попыт вялікі на сельскагаспадарчую тэхніку, на камбайны ў тым ліку, таму хопіць работы ўсім».

## «ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ РАЗАМ»

Прэзідэнт перакананы, што ёсць і больш сур'ёзныя перспектывы па развіцці кааперацыі. З улікам таго, што рынак павялічваецца, па яго словах, трэба працаваць разам. «Мы з вамі правільна зрабілі стаўку на інтэнсіфікацыю сельскай гаспадаркі, не забываючыся пра ключавыя галіны прамысловасці, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — У выніку нам удалося захаваць і развіць цэлы шэраг унікальных кампетэнцый, якія сёння дапамогуць забяспечыць працоўныя месцы і харчовую бяспеку двух дзяржаў. Тым больш Растоўская вобласць — добры кавалак у Расіі для забеспячэння харчовай бяспекі, прытым і вельмі паспяховы».

У той жа час Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што магчымасці Беларусі кіраўніцтву Растоўскай вобласці добра вядомы. «Мы бачым добрыя рэзервы ў паглыбленні ўзаемадзеяння ў сферы аграпрамысловага комплексу, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Беларускі бок гатовы падзяліцца любым назапашаным вопытам, ён у нас ёсць. Калі б мы мелі такія магчымасці ў сельскай гаспадарцы, як у Растоўскай вобласці, мы ўвогуле былі б «у шакаладзе». Аднак Гасподзь не даў такіх магчымасцяў, але, тым не менш, прыстасоўваемся да той сітуацыі, якая ў нас складваецца, клімат мяняецца, я не выключаю, што хутка мы прыйдзем да такой жа схемы апрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, як у вас у Растоўскай вобласці. Нам ваш вопыт сёння вельмі патрэбны і карысны».

У сваю чаргу, Беларусь гатова дзяліцца ў сферы АПК усім тым, што мы ўмеем рабіць: ад падрыхтоўкі кадраў да сельскагаспадарчай тэхнікі. Наш АПК мае шырокія магчымасці. Сярод іх — і насенневы матэрыял, і найноўшыя тэхналогіі ў раслінаводстве і ў жывёлагадоўлі, і будаўніцтва самых сучасных малочнатаварных комплексаў, і камплектаванне іх усім неабходным, абслугоўванне.

«Мы гатовы забяспечваць вашу вобласць самай сучаснай аўтамабільнай, сельскагаспадарчай, дарожнабудаўнічай, камунальнай тэхнікай, — заўважыў Прэзідэнт. — Вы ведаеце магчымасці нашых прадпрыемстваў, гігантскіх прадпрыемстваў: МАЗ, МТЗ, «Амкадор» і інш. Гатовы з вамі працаваць па пасажырскім транспарце. Упэўнены, што для вас гэта тэма не толькі сённяшняга дня, але і на вялікую перспектыву. Набываючы нашу тэхніку, вы можаце быць упэўнены: і заўтра, і паслязаўтра, праз год — мы будзем ажыццяўляць і сэрвіснае абслугоўванне, і пастаўку запасных частак. Мы ніколі не кінем, як гэта зрабілі нашы заходнія партнёры».

Таксама, па словах беларускага лідара, мы гатовы рэалізоўваць сумесныя інвестыцыйныя і інавацыйныя праекты, у тым ліку з удзелам рэгіянальнага бізнесу. «Гэта ў першую чаргу датычыцца пашырэння ўзаемадзеяння ў сферы жыллёвага, сацыяльнага будаўніцтва, — удакладніў Прэзідэнт. — Новыя магчымасці для росту могуць даць сумесныя дарожна-будаўнічыя праекты. Ёсць зацікаўленасць у рэалізацыі вашых рэгіянальных праграм: такіх, напрыклад, як «Чыстая вада». Пры гэтым нельга забываць і гуманітарную галіну: сумесныя праекты адукацыйных устаноў, культурныя абмены, працу ў інфармацыйнай сферы».

Аляксандр Лукашэнка пералічыў многія кірункі супрацоўніцтва, якія могуць стаць паспяховымі для абодвух бакоў. «Калі нарасціць узаемадзеянне толькі ў пералічаных напрамках, а іх насамрэч у разы больш, мы ўжо выйдзем на абсалютна новы ўзровень супрацоўніцтва, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Усё ў нашых руках! Як дамовімся, так і будзе. Мы гатовы да адкрытага і прадметнага дыялогу».

Прэзідэнт перакананы, што і гэтая сустрэча, і праца дэлегацыі з нашым урадам, і наведванне аб'ектаў падчас візіту ў Беларусь, прынясуць значныя вынікі.

## «БАКІ НЕ СТАЯЦЬ НА МЕСЦЫ»

Сваім бачаннем сумесных планаў па ўдасканаленні двухбаковага ўзаемадзеяння падзяліўся губернатар Растоўскай вобласці Васілій Голубеў. Ён выказаў падзяку за тое, што гэтае супрацоўніцтва мае вельмі канкрэтныя напрамкі і бакі дакладна не стаяць на месцы. Сведчанне — за невялікі тэрмін супрацоўніцтва шмат чаго зроблена.

Васілій Голубеў перакананы: тое, аб чым дамовіліся падчас візіту ў Беларусь, павінна быць пакладзена «на зямлю» — а значыць, мець увасабленне ў канкрэтных праектах. Гаворачы пра дынаміку адносін Беларусі з гэтым рэгіёнам Расійскай Федэрацыі, губернатар падкрэсліў: «Мы ўбачылі рост знешнеэканамічных нашых сувязяў, абароту: як у экспарце, так і ў імпарце. Але мы таксама ўбачылі, што далёка не ўсё зрабілі. Думаю, што нашых беларускіх партнёраў, нашых братоў і сяброў, зацікавіць магчымасць развіцця экспартных паставак. Растоўская вобласць — экспартаарыентаваны рэгіён. Мы сёння займаем трэцяе месца па аб'ёме несыравіннага неэнергетычнага экспарту. Па аб'ёме экспарту сярод суб'ектаў Расійскай Федэрацыі мы займаем шостае месца».

Растоўская вобласць забяспечвае 10 % расійскага збожжа. Добрыя вынікі рэгіён дэманструе ў вырошчванні алейных культур. Сланечнікавы алей, як вядома, сёння запатрабаваны на рынку Беларусі. Таму поле для сумеснай дзейнасці нашай краіны і Растоўскай вобласці сапраўды вялікае. Галоўнае, што ў гэтым зацікаўлены абодва бакі.

**Вераніка КАНЮТА.**

## У тэму

У размове з журналістамі **губернатар Растоўскай вобласці Васілій ГОЛУБЕЎ** адзначыў, што калі ўсе дамоўленасці, аб якіх ішла размова падчас візіту дэлегацыі ў Беларусь, будуць не толькі на паперы, а знойдуць адлюстраванне ў канкрэтных рашэннях, то з'явяцца новыя экспартныя магчымасці і ў Расіі, і ў Беларусі. «Мы пачалі гэтым займацца, упэўнены, што знойдзем рашэнне, бо гэта працэс, які ідзе, але цяпер новая сітуацыя і новыя магчымасці, — заўважыў ён. — Я тут бы вылучыў працяг нашай работы ў аграпрамысловым комплексе. Гэта традыцыйны «канёк», які цікавы і Беларусі, і рэгіёну, а галоўнае, людзям. І, як падкрэслілі кіраўніцтва ўрада, міністэрстваў Беларусі і прадстаўнікі Растоўскай вобласці, канкрэтныя крокі рэальна зроблены. Мы, напрыклад, задумаліся аб тым, што — і гэта прапанова беларускага боку — трэба больш актыўна ўключыць ва ўзаемадзеянне будаўнікоў, тых, хто займаецца інжынернымі камунікацыямі. Гэта патэнцыял, які не поўнасцю вычарпаны».

Асобная ўвага, па словах губернатара Растоўскай вобласці, будзе ўдзелена ўзаемадзеянню ў навуковай галіне. У прыярытэце — пытанні развіцця насенняводства, аквакультуры (або рыбы, малька). У гэтым ёсць узаемны інтарэс.

Удасканалення патрабуюць і гуманітарныя адносіны. «Абсалютна дакладна ў парадак дня павінна быць уключана ўзаемадзеянне маладзёжных арганізацый, адукацыйных структур, пры гэтым яны значна хутчэй знойдуць кантакты, чым мы будзем ствараць іх сваімі бюракратычнымі паперамі, — перакананы Васілій Голубеў. — Дакументы, якія мы падпісалі, павінны насіць прыкладны характар. Мы не павінны чакаць пэўнага часу, а адразу рэалізоўваць».

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## The New York Times: настаў час пасадзіць Украіну за стол перагавораў

Канфлікт ва Украіне ўсё больш абвастраецца, і рызыка маштабнай вайны паміж НАТА і Расіяй расце з кожным днём. У гэтых умовах ЗША неабходна пачаць пошук магчымасцяў для дыпламатычнага ўрэгулявання. Такое меркаванне ў артыкуле для газеты The New York Times выказаў старшы навуковы супрацоўнік Савета па міжнародных адносінах, прафесар Джорджтаўнскага ўніверсітэта Чарльз Купчан.

Прафесар адзначыў, што прэзідэнт Джо Байдэн назваў падтрымку Украіны стратэгічным прыярытэтам, але не жыццёва важнай цікавасцю для ЗША. Таму Вашынгтон дае Кіеву зброю і фінансавую дапамогу, але не ўступае ў барацьбу напрамую.

У артыкуле прыводзяцца прыклады таго, калі дзеянні ўкраінскіх улад маглі прывесці да эскалацыі. У прыватнасці, згадваецца выбух аўтамабіля, у якім знаходзілася расійская журналістка Дар'я Дугіна, падрыў Крымскага моста, абстрэлы Белгарада і, нарэшце, напад на расійскія караблі ў Чорным моры, якія адказваюць за бяспеку гуманітарных калідораў для транспарціроўкі ўкраінскага збожжа.

## Патрушаў: Захад нарошчвае магчымасці для разгойдвання абстаноўкі ў іншых краінах



Заходнія дзяржавы ўвесь час нарошчваюць прылады для падтрымкі несістэмнай апазіцыі і эскалацыі канфліктаў у іншых краінах. Як паведамляе ТАСС, пра гэта заявіў сакратар Савета бяспекі Расіі Мікалай Патрушаў на сустрэчы сакратароў саўбезаў краін СНД у Маскве.

Паводле яго слоў, менавіта таму інфармацыйная сфера — сур'ёзная крыніца пагроз на постсавецкай прасторы. Патрушаў падкрэсліў: «Краінамі Захаду пастаянна нарошчваецца прымяненне ўсяго комплексу гібрыдных інструментаў, якія ёсць у іх распараджэнні, прызначаных для насаджэння ліберальных каштоўнасцяў, фінансавання несістэмнай апазіцыі, распальвання міжнацыянальнай варожасці і сепаратысцкіх настрояў, эскалацыі міжканфесійных і этнічных канфліктаў, рэалізацыі сцэнарыяў «каляровых рэвалюцый». Іх галоўнымі інструментамі, як указаў сакратар СБ РФ, па-ранейшаму з'яўляюцца падкантрольныя Вашынгтону няўрадавыя арганізацыі, СМІ і апазіцыйныя лідары.

Акрамя таго, сакратар Савета бяспекі Расіі адзначыў, што прычына глабальнага крызісу, які разгортваецца ў свеце, заключаецца ў імкненні Захаду навязаць усім сваё дамінаванне, поўнасцю ігнаруючы не толькі нацыянальныя інтарэсы, асаблівасці і традыцыі іншых краін, але і аб'ектыўныя тэндэнцыі станаўлення шматпалярнага свету і спынення заходняй гегемоніі.

## Вучоныя высветлілі, як распазнаць дэменцыю за сем гадоў да пачатку

Вучоныя з Каралінскага інстытута высветлілі, што прыкладна за сем гадоў да выяўлення лёгкіх кагнітыўных парушэнняў у чалавека хутка і значна змяншаецца індэкс масы цела (ІМЦ). Даследаванне апублікавана ў JAMA Psychiatry.

Аўтары ацанілі доўгатэрміновыя траекторыі ІМЦ у 1390 удзельнікаў (сярэдні ўзрост 78,4 года, 76,5 % жанчын). Даследчыкі выявілі, што ў параўнанні з удзельнікамі даследавання без дэменцыі ў хворых на яе ІМЦ зніжаўся раней і хутчэй. Чым больш значным было зніжэнне вагі за сем гадоў да выяўлення кагнітыўных парушэнняў, тым мацней паражаўся мозг хворых на хваробу Альцгеймера або сасудзістую дэменцыю. Аўтары навуковай працы лічаць, што ў новых даследаваннях неабходна аб'яднаць даныя ІМЦ з тамаграфіяй мозгу, каб адсачыць сувязь паміж зменай ІМЦ і паталогіямі галаўнога мозгу.

# НАРОДНАМУ ПАЭТУ — НАРОДНАЯ ПАМЯЦЬ



— Творчасць Якуба Коласа ўвасоблена ў музычным, тэатральным, кінематаграфічным мастацтве. І сёння важкае слова класіка гучыць у шматлікіх краінах свету, а яго творы перакладзены на больш чым 40 замежных моў. Шаноўныя сябры, няхай і надалей творы Якуба Коласа натхняюць нас на пабудову моцнай і квітнеючай дзяржавы, распавядаюць аб прыгажосці беларускай зямлі, — пажадаў міністр культуры.

**Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў, што творы класіка, яго вершы і публіцыстыка — гэта грунт жыцця, радасці і трываласці:

— Прыхінуўшыся да яго літаратурных скарбаў, мы становімся багацейшымі шматкроць. Сёння час, калі сацыяльныя сеткі выводзяць нас у іншыя прасторы, магчыма, касмічныя, безумоўна, недасягальныя яшчэ дзесяцігоддзі назад. І мне бачыцца, што велічыня такіх мастакоў слова, і найперш народнага песняра Якуба Коласа, — трывалая ніточка нашай сувязі ў стагоддзях, у часе, у прасторы. Чытайце, шануйце Коласа, вывучайце яго жыццёвы шлях — і станеце шматкроць багацейшымі, зможаце быць сапраўднымі абаронцамі жыцця, лёсу беларусаў і нашай краіны.

Адным з галоўных месцаў, дзе захавалася не толькі спадчына паэта, але і яго дух, з'яўляецца Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. Падчас цырымоніі **дырэктар музея Ірына МАЦЯС** выказала падзяку ўсім, хто дапамагаў ствараць юбілейны год у гонар песняра:

— Класікі жывуць вечна ў сваіх творах, і калі мы станем іх перачытваць, яны будуць жыць у нашых сэрцах, дапамогуць развіць беларускую культуру і нашу родную Беларусь.

## КАСТУСЬ МІЦКЕВІЧ ВЯРНУЎСЯ Ў СТОЎБЦЫ

А жыхары Стоўбцаў у дзень юбілею славутага земляка атрымалі вялікі падарунак — помнік Якубу Коласу. Скульптура ўвасабляе паэта ў народным, вясковым адзенні. Ён быццам прысеў адпачыць на хвілінку, а на яго твары можна заўважыць усмешку.

Пасля правядзення рэспубліканскага конкурсу эскізных праектаў, на які прадставілі каля 20 работ, былі вызначаны аўтары помніка. Над рэалізацыяй праекта працаваў творчы калектыў у складзе скульптараў: заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, народнага мастака Івана Міско, Сяргея Логвіна, Уладзіміра Піпіна, а таксама архітэктараў Уладзіміра Архангельскага і Аляксандра Кобрусева.



Удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця ўзялі першы намеснік міністра культуры Валерый ГРАМАДА, **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр ТУРЧЫН**, а таксама вучні ўстаноў адукацыі раёна.

Аляксандр Турчын звярнуўся да жыхароў і гасцей Стоўбцаў з віншавальнымі словамі:

— Сёння цудоўная нагода, каб сустрэцца на Стаўбцоўскай зямлі: мы святкуем 140-годдзе з дня нараджэння нашага вялікага земляка, паэта, празаіка, публіцыста Якуба Коласа. Яго ўклад у літаратурны скарб нашай краіны складана пераацаніць, таму што ўсе мы, калі вучыліся ў школе, праз яго творы прасякліся любоўю да Беларусі. Выказваю шчырыя словы падзякі ўсім жыхарам Стаўбцоўскага раёна, якія прынялі ўдзел у стварэнні гэтага помніка.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# НА ПОЛІ РЭАЛЬНЫМ І ВІРТУАЛЬНЫМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы сустрэліся з Ігарам Міхайлавічам на полі каля садовага таварыства «Лясная паляна»: з-за хмызняку выплыў вялікі чырвоны трактар з бліскучым дзесяцікорпусным плугам. Здзівілася яшчэ, што механізатар выйшаў з кабіны ў адной футболцы і шортах. На нямое пытанне ў маіх вачах з усмешкай растлумачыў, што ўнутры трактара атмасфера летняя, працуй — не хачу. Яно і праўда: «Кіраўцу» толькі пяць гадоў, як і прычапному агрэгату, але вонкавы і ўнутраны выгляды тэхнікі бліскучыя — у гэтым заслуга руплівага гаспадара.

Ігар Міхайлавіч родам з Бешанковіцкага раёна, прафесійны выбар у бок сельскай гаспадаркі зрабіў не адразу. Аднак сам сямейны летапіс падказваў, што трэба: бацька шмат гадоў адпрацаваў трактарыстам у калгасе «Вядзерава», дзядзька — таксама, маці Ігара была галоўным эканамістам у гэтай жа гаспадарцы, бабуля — загадчыцай зернесушыльнага склада. Пасля школы атрымаў спецыяльнасць токара-фрэзероўшчыка, пасля арміі адчуў, што абраная прафесія не па душы і прайшоў сельскагаспадарчыя курсы, атрымаў вадзіцельскую катэгорыю. З 2004 года пачаў пісаць працоўную біяграфію ў «Вядзерава», а пасля лёс звёў яго з Віцебскім раёнам: паехаў ў камандзіроўку, тут і застаўся. Ва ўнітарным прадпрыемстве «Рудакова» шчыруе ўжо адзінаццаты год, гаспадарка выдзеліла маладой сям'і кватэру.

Масалаў задзейнічаны на ўсіх этапах падрыхтоўкі глебы, у гарачы сезон нараўне з камбайнерамі шчыруе з ранку да вечара. З пачатку асенніх палявых работ падрыхтоўваў глебу пад сяўбу азімых культур, за чырвоным трактарам Масалава з гарэзлівым надпісам на лабавым шкле «Валацуга» ледзьве паспявалі тры сеялкі. Зараз, не збаўляючы набраных тэмпаў, паднімае зябліва — замест дзённай нормы 18 гектараў з лёгкасцю асвойвае 30. Неадназначна Ігар Міхайлавіч станавіўся пераможцам раённых галіновых спаборніцтваў, у скарбонцы ўзнагарод ёсць і першае месца ў вобласці на конкурсе сярод аратых.



Дома пасля цяжкага працоўнага дня мужчыну чакае сям'я: жонка Вольга і двое сыноў Андрэй і Дзмід. Вольга таксама працуе ў «Рудакова», але на цяплічным камбінаце — вырошчвае памідоры. Старэйшы сын Андрэй захапляецца футболам, а малодшы — таткіным трактарам. Чатырохгадовы Дзмід не мінае ні аднаго зручнага выпадку, каб паездзіць з бацькам. У вольны час, хоць зараз яго амаль не бывае, — тры месяцы механізатар працуе без выхадных, — Ігар Міхайлавіч захапляецца рыбалкай. Разам з Андрэем ставяць свае рэкорды на рыбнай ніве: судак амаль на чатыры кілаграмы, з чарговага «ціхага палявання» прывезлі з сынам 13 кілаграмаў ляшчоў. А яшчэ мужчына падзяліўся, што ў мінулым годзе завёў акаўнт у ТікТок, сёння ў механізатара-блогера ўжо звыш 22 тысяч падпісчыкаў. Галоўны герой відэаролікаў — яго жалезны конь «Кіравец», або, як яго ведае аўдыторыя, «Валацуга». Масалаў здымае вясёлыя палявыя моманты і расказвае, што ў многіх яго калег таксама ёсць такое захапленне. Пазітыў і бадзёры настрой Ігара Міхайлавіча, які ідзе ад яго па жыцці нават у гарачыя палявыя сезоны, перадаецца праз экран і натхняе на працоўныя дасягненні іншых работнікаў сельскай гаспадаркі. Галоўнае, лічыць Масалаў, падыходзіць да кожнай справы з натхненнем і ўпартасцю, тады і на сэрцы лягчэй, і душа радуецца.

Яшчэ ў верасні працоўны дзень механізатара пачынаўся з шасці гадзін раніцы і працягваўся амаль да адзінаццаці гадзін вечара — дазваляла надвор'е. Зараз трактарыст таксама працуе да позніх прыцемкаў, хапаючы кожную хвіліну, каб пакінуць на полі свежыя чорныя разоры. У яго нават асабісты працоўны распарадак: а палове сёмай завёў тэхніку і шчыруе да абеду, пасля гадзінка адпачынку — і зноў да вечара за штурвал. Галоўным у сваёй прафесіі лічыць упартасць і ўвагу да кожнага моманту: ці то адкручаная гайка, ці то цяжкі ўчастак поля — усё павінна быць якасна. А яшчэ — пазітыўны настрой па жыцці, якім за паўгадзіны механізатар зарадзіў і мяне.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

Блізкая ўлада

# Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 5 лістапада, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Віктаравіч ДУРНОЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васільевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена Васільеўна ПАСЮТА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Бяспека

Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ:

# «Прымяненне ядзернай зброі недапушчальнае»

**Аб гэтым заявіў дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі Аляксандр Вальфовіч па выніках праведзенай у Маскве 10-й сустрэчы сакратароў саветаў бяспекі дзяржаў — удзельніц СНД, паведаміла БелТА.**

«Былі закрануты пытанні ядзернай бяспекі. Сёння ўсё больш і больш гавораць аб прымяненні тактычнай ядзернай зброі. Гэта недапушчальна. І ўсё роўна — тактычная або стратэгічная ядзерная зброя. Гэта прывядзе да незваротных наступстваў, гібелі цывілізацыі, па-іншаму ніяк не скажаш», — падкрэсліў Аляксандр Вальфовіч.

Ён адзначыў, што Беларусь ужо 36 гадоў змагаецца з наступствамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС, аднак наступствы прымянення ядзернай зброі будуць значна страшнейшыя. «Што будзе, калі сапраўды прыменяць баявую тактычную ядзерную зброю? Еўропа ўся пацерпіць, гэта закране не толькі тэрыторыю Расіі, Украіны або Беларусі. Гэтае полымя ўспыхне і закране ўсе краіны Еўропы, а можа быць, нават і больш», — сказаў дзяржсакратар Савета Бяспекі.

На сустрэчы сакратароў саветаў бяспекі краін СНД абмяркоўваліся актуальныя пытанні міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, у тым ліку развіццё сітуацыі на постсавецкай прасторы ў кантэксце спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне, якая праводзіцца Расіяй. Разглядаліся пытанні супрацьдзеяння дэструктыўнай дзейнасці замежных няўрадавых арганізацый, гераізацыі фашызму і фальсіфікацыі гісторыі ў дзяржавах СНД. Акрамя таго, удзельнікі нарады абмеркавалі праблематыку забеспячэння ядзернай бяспекі і нераспаўсюджвання ядзернай зброі.

Добрая навіна

# УЗРАСЛІ ДАПАМОГІ І ПЕНСІІ

**Адпаведная пастанова Міністэрства працы і сацыяльнай абароны зацвердзіла памеры бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах на перыяд з 1 лістапада. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе ведамства.**

Такім чынам, бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ўстаноўлены ў памеры 339 рублёў 83 капейкі, што на 3,4 % вышэй у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў з 1 жніўня да 31 кастрычніка. Ён складаў 328 рублёў 50 капеек.

Пры гэтым памеры бюджэту пражытачнага мінімуму для працаздольнага насельніцтва складаюць 375,26 рубля (раней — 366,23 рубля), для пенсіянераў — 255,28 рубля (раней — 247,21 рубля), для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 215,93 рубля (раней — 204,8 рубля), для дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 298,21 рубля (раней — 284,6 рубля), для дзяцей ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў — 363,28 рубля (раней — 350,06 рубля).

Ад памеру бюджэту пражытачнага мінімуму залежыць памер аднаразовых выплат пры нараджэнні дзіцяці, мінімальных працоўных і сацыяльных пенсій, надбаўкі, павышэнні да пенсій і даплаты беларусам 75 гадоў і старэйшым, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацабароне, а таксама дапамогі па доглядзе інваліда I групы ці асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту. Гэтыя выплаты павялічыліся адпаведна росту БПМ на 3,4 %.

## ПЕНСІІ ВЫПЛАЦЯЦЬ ДАТЭРМІНОВА

Выплата пенсій і дапамог за 7 лістапада 2022 года будзе ажыццяўляцца ў паштовых аддзяленнях датэрмінова. Як паведамляе прэс-служба «Белпошты», з 4 лістапада пачнуцца выплаты ў аддзяленнях паштовай сувязі беларускай сталіцы. У астатніх паштовых аддзяленнях нашай краіны выдача пенсій будзе рабіцца з 5 лістапада.

Што датычыцца святочнага дня, то 7 лістапада будуць працаваць і прапаноўваць свае паслугі насельніцтву толькі дзяжурныя аб'екты паштовай сувязі, з пералікам якіх можна азнаёміцца на карпаратыўным сайце РУП «Белпошта».

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# ЧАС ВОСЕНЬСКІХ ДАЖДЖОЎ

Лістапад у нас — гэта калі днём не больш за 12 градусаў цяпла, а ўначы — усё бліжэй да нуля, месцамі замаразкі

**Як ні круці, а на дварэ апошні месяц восені. Далей будзе халадней. Вось і заканчваецца гэты тыдзень няўстойлівым надвор'ем з дажджамі рознай інтэнсіўнасці, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сіноптыкі абяцаюць, што да канца тыдня франтальныя раздзелы будуць прыносіць усё новыя і новыя «порцыі» ападкаў, а тэмпературны фон будзе даволі кантрасны. У пятніцу па ўсходняй частцы Беларусі яшчэ захаваецца ўплыў франтальных раздзелаў, якія абумовяць у дадзеных рэгіёнах невялікія дажджы. Максімальная тэмпература паветра чакаецца ад плюс 5 да 11 градусаў.

У суботу будзе холадна, але сонечна. У гэты дзень тэрыторыя краіны акажацца на заходняй перыферыі антыцыклону, дзякуючы чаму істотных ападкаў па краіне не чакаецца. Ноччу і раніцай у асобных раёнах будзе туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 3 градусаў па паўночным усходзе да плюс 6 градусаў па паўднёвым захадзе. Днём чакаецца да плюс 4 — 10 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны ў сярэдзіне дня паветра прагрэецца да плюс 12 градусаў.

Уначы 6 лістапада пераважная частка тэрыторыі нашай краіны застанецца пад «крылом» зоны павышанага атмасфернага ціску, а вось на захадзе раёны праверэцца атмасферны фронт, і тут час ад часу прагназуюцца дажджы. Раніцай і днём франтальны раздзел працягне сваё шэсце праз Беларусь, і дажджы распаўсюдзяцца на большую частку краіны. Месцамі будуць згушчацца непрацяглыя туманы. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 3 — плюс 4 градусы, а па захадзе — плюс 5 — 9 градусаў. Днём будзе плюс 3 — 9 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да плюс 11.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, няўстойлівае з дажджамі надвор'е захаваецца і ў першай палове наступнага тыдня. У панядзелак, на свята 7 лістапада, у многіх раёнах краіны пройдуць дажджы. Месцамі магчымы туман. Ноччу тэмпература паветра будзе вагацца ад 0 да плюс 7 градусаў, а па ўсходзе пры праясненнях — да мінус 2 градусаў. Удзень тэмпература паветра складзе плюс 4 — 10 градусаў. Па паўднёвым захадзе краіны ноччу чакаецца плюс 8—9, а днём — да 12 градусаў цяпла.

Чакаецца, што ў аўторак начных замаразкаў ужо не будзе. У гэты дзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах згусціцца туман. Тэмпература паветра ноччу будзе 0 — плюс 7 градусаў, а днём — 5 — 12 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Медыясфера

**Андрэй КРЫВАШЭЕЎ:**

# «Мінчане давяраюць нашаму газетнаму і медыйнаму брэнду»

## Газета «Вечерний Минск» адзначае 55-годдзе

**Сімвалічна, што гэтае папулярнае сёння выданне з'явілася акурат у той год, калі беларусы святкавалі 900-годдзе Мінска. Зрабіўшы сабе такі падарунак да прыгожай даты, гарадскія ўлады наладзілі больш якасную і аператыўную сувязь з народам. А яшчэ «Вечерний Минск» стаў летапісцам гарадскога жыцця — дзякуючы газетным падшыўкам, можна падрабязна вывучаць гісторыю развіцця беларускай сталіцы.**

Сёння перыядычнае выданне з'яўляецца адным з найбольш уплывовых медыя інфармацыйнага агенцтва «Мінск-Навіны». Як развіваецца «Вечерний Минск», у чым перавагі гарадской прэсы і якія тэндэнцыі сучаснай журналістыкі варта выкарыстоўваць у выдавецкай дзейнасці, расказаў **генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва «Мінск-Навіны», старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ.**

***— Андрэй Яўгенавіч, як мінчане ўспрынялі выхад газеты «Вечерний Минск» у лістападзе 1967 года і наколькі яна была неабходная менавіта ў той гістарычны перыяд?***

— «Вечерний Минск» адразу стала галоўнай народнай гарадской газетай і была вельмі запатрабаваная. Акрамя найважнейшай грамадска-палітычнай інфармацыі, якая ў ёй друкавалася, — маштабныя выступленні, падрыхтоўка да з'езду кампартыі Савецкага Саюза, ключавыя даклады, якія на іх гучалі, кіраўнічыя рашэнні мінскіх улад — з першага ж нумара з'явілася зваротная сувязь газеты з гараджанамі. Цікава гартаць старую падшыўку, даведвацца аб пытаннях, якія хвалявалі тагачаснага чытача: распаўсюджванне тэлевізійнага сігналу ў Мінску, экалогія горада, будаўніцтва метро, самаадчуванне працоўных калектываў, праблемы, з якімі ў 1960-х гадах сутыкаліся сталічныя прадпрыемствы. Выданне першапачаткова выбрала для сябе гэтую нішу, якую мы беражліва захоўваем, застаючыся народнай карыснай газетай — галоўнай газетай для мінчан.

***— Працяглы час чытачы атрымлівалі «Вячорку» менавіта вечарам — аб гэтым сведчыць і назва газеты. У апошнія гады выданне пачалі бясплатна раздаваць у метро. Як цяпер газета трапляе да спажыўца інфармацыі?***

— У нас засталася тая цудоўная магчымасць, і статысячны тыраж «Вечернего Минска», які выходзіць цяпер раз у тыдзень (па чацвяргах), распаўсюджваецца бясплатна. Прычым не толькі ў метро. Гэта і найбуйнейшыя прадпрыемствы сталіцы, куды мы развозім свежую «Вячорку», і ўніверсітэцкія кампусы, гаражы, інтэрнаты, самі ўніверсітэты, і адміністрацыі раёнаў, адкрытыя прыёмныя буйных грамадскіх аб'яднанняў. Выданне карыстаецца вялікай папулярнасцю: у новых медыя нямала забаўных ролікаў, якія дэманструюць, як раніцай мінчане ў метро чакаюць дастаўку газеты, потым актыўна яе



разбіраюць. Акрамя таго, у нас ёсць падпіска, а значыць, і пастанныя чытачы «Вячоркі», якія хочуць, каб газету ім дастаўлялі дадому або на рабочае месца, — гэта яшчэ прыкладна чатыры тысячы чалавек. У цэлым, тыраж газеты складае 104—105 тысяч экзэмпляраў. Плюс падчас найважнейшых грамадска-палітычных кампаній у Рэспубліцы Беларусь — такіх, як напрыклад, правядзенне рэферэндуму па змяненнях і дапаўненнях у Канстытуцыю — у нас выходзяць спецыяльныя тыражы. Да рэферэндуму па канстытуцыйных навацыях выйшлі два спецыяльныя выпускі агульным тыражом 400 тысяч экзэмпляраў. Мінчане вельмі ўважліва чыталі «Вячорку», паколькі давяраюць нашаму газетнаму і медыйнаму брэнду. Пры гэтым, падкрэслю, «Вечерний Минск» застаецца менавіта народнай газетай. Гэтая народнасць — практычная частка нашай газеты, якая звязана з аглядам найважнейшых палітычных і культурных падзей горада. Афіша, магчымасць працаўладкавання, агракаляндар (так званы каляндар дачніка), праграма перадач, анонсы тэатральных сезонаў — тое, што заўсёды падабаецца мінчанам.

***— У гарадской прэсы — свая спецыфіка. У чым перавагі «Вечернего Минска» ў параўнанні з той жа рэспубліканскай перыёдыкай?***

— У «Вечернего Минска» як у галоўнай гарадской газеты пераваг нямала. З аднаго боку, гэта вялізны давер і аўтарытэт у нашых чытачоў, слухачоў, гледачоў, паколькі «Вячорка» сёння — кросмедыйны прадукт. З іншага, мы карыстаемся такім жа заслужаным даверам у нашых заснавальнікаў: Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, якія падключаюць нас, журналістаў, да выпрацоўкі рашэнняў яшчэ ў працэсе іх абмеркавання. Дапусцім, калі тое датычыцца гарадской забудовы, пытанняў ЖКГ, экалогіі, буйных інфраструктурных праектаў, у нас ёсць унікальная магчымасць арганізаваць на сваёй пляцоўцы — у рэдакцыі, на старонках нашай газеты або на партале — абмеркаванне таго ці іншага перспектыўнага рашэння або пытання. Плюс яшчэ адна наша вялікая перавага заключаецца ў тым, што мы даходзім да самых, як здаецца з пункту гледжання буйных рэспубліканскіх медыяхолдынгаў, нязначных пытанняў — таго, што ў журналісцікы называецца драбнатэмнасцю. На самай справе, для гарадской газеты няма нязначных тэм. Для нас усё важнае: і даступнасць дзіцячага садка або школьных сняданкаў, і правядзенне капрамонту таго або іншага дома або квартала, і арганізацыя зон адпачынку ці будаўніцтва школьнага стадыёна. Мы карыстаемся сваёй перавагай, што можам дайсці да кожнага пад'езда, кожнага нашага чытача. Акрамя таго, у нас ёсць шырокі канал зваротнай сувязі: гэта кросмедыйныя праекты, якія існуюць у «Вячорцы», на партале, нашых стрымах, у радыёэфіры. Мінчане праз нас адрасуюць пытанні таму ці іншаму гарадскому кіраўніку, начальніку, дэпутату. Апошні год актыўна развіваем яшчэ і гарадскія стрымы — дыскусійныя пляцоўкі, на якіх узнімаюцца і гарадскія, і рэспубліканскія, і міжнародныя тэмы. Гасцямі стрымаў, з аднаго боку, становяцца, напрыклад, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў або Андрэй Бугроў, старшыня Мінгарсавета дэпутатаў, дэпутаты, кіраўнікі рознага ўзроўню ў залежнасці ад тэм і запытаў, якія паступілі, з іншага боку, самае шырокае прадстаўніцтва мінчан. У «Вячорцы» па выніках такіх стрымаў мы даём сур'ёзную аналітыку — робім высновы грамадскіх дыскусій. Гэта яшчэ адна перавага, якая прыцягвае да нашай газеты дадатковую ўвагу аўдыторыі.

***— Юбілей — не толькі час, калі прынята падводзіць пэўныя вынікі. Прыгожая дата з'яўляецца добрай нагодай і для пастаноўкі задач на перспектыву...***

— Самая галоўная задача для ўсіх медыйшчыкаў Беларусі — стаць заканадаўцамі мод у інфармацыйнай прасторы свайго рэгіёна, краіны ў цэлым, а яшчэ лепш, у руска- і беларускамоўным сегментах нашага інфармацыйнага поля. Добрым вынікам стане тое, калі інфармацыйны парадак дня не будзе падкідвацца нам звонку, а мы самі будзем фарміраваць тыя навінныя, аналітычныя, грамадскія і эканамічныя трэнды, якія знойдуць адлюстраванне на старонках нашых медыя. Гэта задача нумар адзін. Адсюль — і кросмедыйнасць, і ўніверсальнасць журналістаў, і патрабаванні да якасці нашага аўдыявізуальнага рада, які ўжо блізкі да класічнай тэлевізійнай журналістыкі. Актуальнай застаецца і бясконцая, вечная гонка журналіста за навіной: менавіта наш журналіст, прынамсі ў Мінску, павінен першы даведвацца, што адбываецца ў горадзе, і даносіць тое да аўдыторыі, адлюстроўваючы як мага больш меркаванняў і пазіцый, раскрываючы тую ці іншую падзею. Гэта асноўная задача. Калі мы з ёй справімся, то наша інфармацыйная прастора — гарадская, рэспубліканская, прастора Саюзнай дзяржавы — будзе абароненая, і грамадства панясе значна менш выдаткаў ад так званых інфармацыйных, гібрыдных, кагнітыўных ужо сёння войнаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з архіва Андрэя КРЫВАШЭЕВА.**

Кніжны свет

# БЕЛАРУСКАЯ КНІГА — У КІТАІ




**У Пекіне падрыхтаваны да друку ў перакладзе на кітайскую мову зборнік паэзіі і прозы беларускіх пісьменнікаў — «Выбраныя творы сучасных беларускіх пісьменнікаў». Над выхадам кнігі ў свет рупіцца Выдавецтва Кітайскага міжнароднага радыё.**

Ініцыятар выдання — доктар філалагічных навук, кіраўнік Цэнтра Беларусі ў Другім Пекінскім дзяржаўным універсітэце замежных моў Чжан Хуэйцінь. На працягу некалькіх гадоў яна падбірала для бібліятэкі Цэнтра кнігі беларускіх пісьменнікаў на беларускай і рускай мовах, разам з калегамі, студэнтамі і выкладчыкамі ўнікліва паглыблялася ў вывучэнне сучаснага літаратурнага працэсу ў Беларусі. Перакладчыкамі твораў паэзіі і прозы выступілі Хан Сяоэ, Сінь Мэн і Чжан Хуэйцінь.

У раздзеле прозы прадстаўлены апавяданні, казкі і вершы Алеся Бадака, Андрэя Федарэнкі, Алеся Карлюкевіча, Юліі Алейчанкі, Алега Жданa, Вікторa Шніпа, Леаніда Дранько-Майсюка, народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна.

Будзем спадзявацца, што гэта — пачатак сур'ёзнай работы па прадстаўленні сучаснай беларускай літаратуры ў Кітаі. У другой палове XX стагоддзя ў Кітаі асобнымі выданнямі ўбачылі свет кнігі Якуба Коласа, Янкі Купалы, Аркадзя Куляшова, Кандрата Крапівы, Паўла Кавалёва, Алеся Адамовіча, Максіма Танка, Івана Шамякіна, Васіля Быкава, Петруся Броўкі, іншых беларускіх паэтаў і празаікаў. Сёння ў ВНУ Беларусі вучацца студэнты, магістранты, аспіранты, якія праяўляюць увагу да даследвання беларускай мастацкай літаратуры. Магчыма, яны і стануць перакладчыкамі твораў паэтаў і празаікаў Беларусі на кітайскую мову.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

## У эфіры

# Зорны шлях народных талентаў

**Ужо ў гэтую суботу, 5 лістапада, у эфіры тэлеканала АНТ адбудзецца гучная прэм'ера — старт шоу «Зорны шлях».**

Праект стаў магчымасцю для звычайных беларусаў, прафесійная дзейнасць якіх не звязана з вакалам, стаць сапраўднымі артыстамі. Прадзюсары конкурсу правялі кастынгі ва ўсіх рэгіёнах і дазволілі паказаць свае здольнасці будаўнікам, хімікам, грузчыкам, мастакам, настаўнікам, чыгуначнікам. Адбіралі ўдзельнікаў проста на іх рабочых месцах. У выніку творчая каманда «Зорнага шляху» адабрала для далейшага спаборніцтва 30 найлепшых вакалістаў (па пяць выканаўцаў ад кожнага рэгіёна). А назіраць за іх шляхам скарэння вялікай сцэны пад кіраўніцтвам вопытных прадзюсараў будзем цяпер на тэлеканале АНТ.



# Музыка з нагоды свята

**На сацыякультурным тэлеканале 5 лістапада пакажуць тэлеверсію ўрачыстага канцэрта, прымеркавана да 85-годдзя Белдзяржфілармоніі.**

У выкананні вядучага музычнага калектыву краіны — Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь — прагучаць сімфанічнае скерца «Вучань Чарадзея» П. Дзюка і кантата «Тры рускія песні» С. Рахманінава (пры ўдзеле Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Р. Шырмы). Таксама ўдзел ва ўрачыстым вечары ўзялі і праслаўленыя музыканты з Санкт-Пецярбурга. У іх выкананні прагучаць Канцэрт № 1 для віяланчэлі з аркестрам К. Сен-Санса, рапсодыя на тэму Паганіні для фартэпіяна з аркестрам С. Рахманінава.

Варта адзначыць, што згаданы канцэрт да 85-годдзя філармоніі адкрыў 48-ы фестываль «Беларуская музычная восень», які сёлета праходзіць з 25 кастрычніка да 29 лістапада. Музычны форум традыцыйна аб'ядноўвае найлепшыя ўзоры сусветнай музычнай спадчыны. Таму натхняйцеся і пасля завітвайце ў філармонію, каб паслухаць найлепшае ў выкананні найлепшых і ў жывым гучанні.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

**Выпуск № 158**

**Сёлетнія першынствы Брэсцкай вобласці сярод дарослых выйгралі 10-гадовы Радзівон Сідарэня (Баранавічы) і 11-гадовая Дарыя Скамарошчанка (Брэст). У партыі Дарыя Скамарошчанка — Мілена Сідарэня белыя эфектна перамаглі (*гл. дыяграму*).**



**Белыя:** Крс1, Фd2, Лg1, Лh3, Cd3, Cf4, пп. a2, b3, d4, f2, g4, g6 (12).

**Чорныя:** Крg8, Фb6, Ла8, Лf8, Сс3, Kd7, Kf6, пп. a3, d5, e6, f7, g7 (12).

Ход і выйгрыш белых.

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru**

* * *

У сучаснай шахматнай кампазіцыі вельмі папулярныя задачы на кааператыўны мат (чорныя пачынаюць і дапамагаюць белым даць ім, г. зн. чорным, мат; адпаведна, і хады чорных запісваюцца першымі). Вось некалькі нескладаных прыкладаў, якія друкуюцца ўпершыню (два з іх склаў вядучы аддзела).

**Белыя:** Крh6, Лd3, Cf4 (3).

**Чорныя:** Кра6, Лg5, пb5 (3).

Каапмат за 2 хады.

У гэтым жанры дапускаецца і нават вітаецца некалькі рашэнняў. Тут іх два: 1. Лg7 Ce3 2. Лb7 Ла3х і 1. Кра5 Cd6 2. Кра4 Ла3х; ёсць і некалькі блізнят: а) памяняць каралёў месцамі; б) Кра6 на f7; в) Кра6 на g1; г) Cf4 на c4. Рашэнні адпаведна такія: а) 1. Крh5 Лd6 2. Лg4 Лh6х; б) 1. Крg8 C:g5 2. Крh8 Лd8х; в) 1. Крh1 Лd2 2. Лg1 Лh2х і 1. Лg2 Cg3 2. b4 Лd1х; г) 1. Кра5 Лd6 2. b4 Ла6х

Апошнім часам у жанры каапматаў стала модна, каб пачыналі белыя, як у наступнай **задачы.**

**Белыя:** Крg2, Фа7 (2).

**Чорныя:** Крd5, Лс4, Cb7 (3).

Каапмат за 2,5 хода.

Рашае 1...Фа3 2. Крd4+ Крf2 3. Cd5 Фе3х Тут таксама ёсць блізняты: а) Фа7 на b8, Лс4 на е6; б) Лс4 на с5, Крg2 на h2. Рашае адпаведна: а) 1... Фf8 2. Кре5+ Крg3 3. Cd5 Фf4х; б) 1...Крg3 2. Са6 Крf4 3. Сс4 Фd7х.

А ў трэцяй задачы (склаў Дзмітрый Жылко, друкуецца ўпершыню) спачатку заданне выканаць немагчыма.

**Белыя:** Крh4, пg6 (2).

**Чорныя:** Крh6, пп. b2, h7 (3).

Каапмат за 2 хады.

Гэта так званая нулявая (зеро) пазіцыя. Каб заданне выконвалася, трэба яе трохі змяніць: а) дадаць белага слана h8; б) пешка b2 на g2. Тады рашае: а) 1. b1C g7 2. Cg6 g8Кх; б) 1. g1Л gh 2. Лg6 h8Фх. Квартэт пешачных пераўтварэнняў.

У Мінску прызёрамі Мемарыялу Анатоля Аліпава (60 удзельнікаў) сталі Максім Царук, Мікіта Маёраў і Арцём Стрыбук. Прызавую тройку турніру па бліцы ў Гродне (57 гульцоў) склалі Мікіта Маёраў, Максім Царук і Андрэй Гаравец, сярод жанчын найлепшы вынік паказала Таццяна Берлін. У Брэсце Мемарыял Настассі Волчак па бліцы (44 удзельнікі) выйграў Яўген Якавенка, другой была Алена Шабан, трэцім — Уладзіслаў Каташук. Першынство Баранавіч выйграў Аляксей Грыгаровіч. У Мемарыяле Валера Дзям'яна (Румынія) па завочных шахматах у групе «Д» перамог Мікалай Янушэўскі.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Фа4. Правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Дарошчанка, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





## Сядзі і глядзі

# «НЯЎЛОЎНЫЯ МСЦІЎЦЫ» — НА «БЕЛАРУСЬ 3»

**Гледачам і ў галаву не прыходзіла, што «няўлоўныя» маглі так і не з'явіцца на савецкіх кінаэкранах. Бо супраць іх гулялі не толькі разумныя і хітрыя «вашы благароддзі», але і яго вялікасць выпадак... На здымках юныя акцёры не раз аказваліся на валаску ад гібелі. І ўсё гэта для таго, каб у выніку ўступіць у схватку з мастацкім саветам кінастудыі, якому фільм катэгарычна не падабаўся. Больш падрабязна пра закулісе працэсу стварэння кінастужкі гледачы сацыякультурнага тэлеканала змогуць даведацца з дакументальнага фільма «Вялікае кіно. Няўлоўныя мсціўцы», таксама ў эфіры з 5 да 7 лістапада запланаваны паказы ўсіх трох частак гэтай кінаработы.**



Першы фільм так і называўся — «Няўлоўныя мсціўцы». Яго рэжысёр Эдмонд Кеасян зняў у 1966 годзе... Героіка-прыгодніцкая кінастужка, дзе зняліся Васіль Васільеў, Віктар Касых, Валянціна Курдзюкова, Міхаіл Мяцёлкін, Іна Чурыкава і шэраг іншых акцёраў, распавядае пра прыгоды чатырох падлеткаў у гады Грамадзянскай вайны па аповесці Паўла Бляхіна «Чырвоныя чарцяняты» (1921 г.). У сваім творы аўтар імкнуўся рамантызаваць барацьбу за ўладу. Аповесць мела настолькі вялікую папулярнасць, што яе нават ставілі ў тэатрах па ўсёй краіне. У 1923 годзе з'явіўся аднайменны фільм рэжысёра Івана Перэсціяні. А вось ужо «Няўлоўныя мсціўцы», паводле адной легенды, свайму з'яўленню абавязаныя нейкаму начальніку кінастудыі «Масфільм», які быў апантаны ідэяй зняць айчынны вестэрн на хвалі папулярнасці амерыканскай «Цудоўнай сямёркі».

Калі распачаліся здымкі «Няўлоўных мсціўцаў», імя іх рэжысёра ўжо было вядомае па такіх работах, як кінастужка «Лесвіца», кароткаметражка «Тры гадзіны дарогі», камедыя «Кухарка». І цяпер Эдмонд Кеасян вырашыў паспрабаваць сябе ў новым жанры, які потым крытыкі ахрысцілі істэрнам па аналогіі з вестэрнам. Першапачаткова фільм рэжысёрам задумваўся як казка для яго



шасцігадовага сына. Быў напісаны сцэнарый пад назвай «Знак чатырох», дзе аўтары змянілі арыгінальны сюжэт: у тым ліку з'явіўся чацвёрты герой, хоць у кнізе іх трое. Канчатковая назва кінастужкі ўзнікла ўжо на здымачнай пляцоўцы. Вобраз саміх мсціўцаў зборны, і ўсё ж пасля прагляду фільма яго героям хацелася адпавядаць...

Што да пошуку акцёраў на галоўныя ролі, то спачатку іх планавалі набраць з прафесійных студэнтаў УДІКа, аднак шукалі тую самую чацвёрку па спартыўных школах, цыркавых вучылішчах, іпадромах. Напрыклад, актрысу на роль Ксанкі знайшлі ў спартзале, ёю стала кандыдат у майстры спорту па спартыўнай гімнастыцы 14-гадовая Валя Курдзюкова.

Адметны фільм яшчэ і тым, што ў ім трукі (іх было 43) выконвалі самі акцёры. Так, Віктар Касых згадваў некаторыя эпізоды, пасля якіх цудам выжыў: «...Там я спыняю коней, якія шалёна скачуць. Я тады няўдала выскачыў на дарогу, і коні ўзялі ўбок. Аглобляй мяне збіла з ног, і ўся тачанка праехала па мне. Складана ў тое паверыць, але тады я самастойна ўстаў на ногі». Наогул, рэжысёр вельмі адказна ставіўся да падрыхтоўкі сваіх галоўных герояў. Чацвёрку амаль тры месяцы ўзмоцнена трэніравалі ў самба, верхавой яздзе, плаванні. Валя не хацела адставаць ад таварышаў у кадры, таму таксама плавала і нырала, а ў выніку ў дзяўчыны забалелі вушы і яна трапіла ў бальніцу. Але самым небяспечным лічыцца эпізод, дзе цягнік прарываецца праз мост, што гарыць. Там героі ігралі ў кампаніі самога рэжысёра, які быў задзейнічаны як машыніст цягніка.. А пасля ўжо з'явіўся і працяг легендарных прыгод — фільмы «Новыя прыгоды няўлоўных» (1968 г.) і «Карона Расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя» (1972 г.). Апошні фільм, як і першы ў свой час, стаў лідарам у пракаце, сабраўшы аўдыторыю ў 60 мільёнаў гледачоў.

**Алёна ДРАПКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

### Беларусь 1

**6.50 Драма «Адзін удых» (12+).**
**8.30** Сэнс жыцця (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40** Навіны надвор'я.
**11.05, 15.10 Фільм «Сляды на вадзе» (16+).**
**13.05, 15.10 Драма «Неапалімая купіна» (16+).**
**20.50** «Фактар.by».
**21.00** Панарама.
**21.40** Зразумелая палітыка.
**22.00 Драма «Аддай сваё жыццё» (16+).**
**1.15** Арэна.
**1.35** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
